# ГІСТОРЫЯ І БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА

**І. В. Грабянчук**

## ДА ПЫТАННЯ АБ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ГЕРОЯХ БЕЛАРУСІ
(на прыкладах прыватных апытанняў беларускіх студэнтаў і школьнікаў)

Для менталітэту сучасных народаў істотнае значэнне мае паняцце “нацыянальны герой”. Нацыянальныя (народныя) героі – гэта асаблівая катэгорыя асоб і персанажаў, якія карыстаюцца вялікай любоўю і папулярнасцю сярод простых людзей, памяць якіх, як вядома, і забяспечвае ім несмяротную славу. Яны могуць быць выдуманымі, напалову легендарнымі, а таксама рэальнымі гістарычнымі дзеячамі, учынкі і жыццё якіх трапляюць у фокус увагі ўсё новых і новых пакаленняў.

Мне заўсёды было цікава ведаць, якія персанажы айчыннай гісторыі маюць найбольшую любоў і павагу ў беларускім грамадстве, асабліва ў моладзі. Тэма нацыянальных герояў мае адметнае месца ў змесце розных прадметаў, якія вывучаюцца ў сярэдняй школе, а таксама вучэбных дысцыплін – ва ўстанове вышэйшай адукацыі. Мне давялося працаваць на розных узроўнях сістэмы адукацыі нашай краіны. Напрыклад, у 2001 г. я меў тры месцы працы: сярэдняя школа № 10 г. Светлагорска Гомельскай вобласці (асноўнае) і два па сумяшчальніцтве: Светлагорскі індустрыяльны тэхнікум і Светлагорскі філіял Прыватнага інстытута кіравання і прадпрымальніцтва. Працуючы з такім рознаўзроставым кантынгентам навучэнцаў, я задаўся пытаннем: а як будуць адказваць на адно і тое ж пытанне мае рэспандэнты ва ўзросце ад 15 да 50 гадоў?

Тады, у 2001 г., я і вырашыў папрасіць сваіх школьнікаў і студэнтаў вызначыць з іх пункту гледжання 5 найбольш выдатных асоб у айчыннай гісторыі, якіх можна аднесці да катэгорыі нацыянальных герояў. Падлік галасоў быў дастаткова простым: тая асоба, якую рэспандэнт ставіў на першае месца, атрымлівала 5 балаў, на другое – 4 балы, на трэцяе – 3 балы і гэтак далей. Усяго ў той прыватнай апытанцы ўзялі ўдзел 182 чалавекі. Называць можна было толькі рэальных асоб з любых гістарычных эпох – ад старажытнасці да сучаснасці.

У 2022 г., калі я прыйшоў на працу ў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, мне захацелася паўтарыць апытанку на гэтую ж тэму, праўда ўжо ў меншых маштабах. Дадатковым стымулам да такой справы стала выкладанне новай вучэбнай дысцыпліны – гісторыя беларускай дзяржаўнасці. Апытаннем былі ахоплены дзве групы першакурснікаў дзённай формы навучання факультэта міжкультурных камунікацый МДЛУ, а таксама адна група завочнікаў (факультэт англійскай мовы). Цікава было даведацца, як змянілася ўспрыманне тэмы нацыянальных герояў у асяроддзі студэнцкай моладзі праз два дзесяцігоддзі.

Калі выявіліся першыя 5 нацыянальных герояў паводле версій 2001 і 2022 гг., то пэўную цікавасць выклікала пытанне, а каго ж мае рэспандэнты памясцілі на наступныя пяць пазіцый? Вынікі двух апытанняў для большай зручнасці ўспрымання прадставім у наступнай форме.

| 2001 г. | 2022 г. |
| --- | --- |
| 1. Францыск Скарына | 1. Францыск Скарына |
| 2. Кастусь Каліноўскі | 2. Св. Еўфрасіння Полацкая |
| 3. Св. Еўфрасіння Полацкая | 3. Кастусь Каліноўскі |
| 4. Янка Купала | 4. Тадэвуш Касцюшка |
| 5. Якуб Колас | 5. Пётр Машэраў |
| 6. Аляксандр Лукашэнка | 6. Янка Купала |
| 7. Рагвалод | 7. Якуб Колас |
| 8. Вітаўт | 8. Вітаўт |
| 9. Пётр Машэраў | 9. Леў Сапега |
| 10. Усяслаў Чарадзей | 10. Васіль Быкаў |

Якія высновы можна зрабіць паводле гэтых дадзеных?

Пантэон нацыянальных герояў Беларусі ўпэўнена ўзначальвае беларускі першадрукар, асветнік Францыск Скарына. І ў першым і ў другім выпадку ён значна апярэдзіў усіх сваіх, умоўна кажучы, канкурэнтаў па колькасці галасоў. Калі ў будучыні ў Беларусі будзе грашовая рэформа, і на новых купюрах з'явяцца яе нацыянальныя героі, то на самай буйной з іх можна смела размясціць партрэт Скарыны.

На другой і трэцяй пазіцыі памяняліся месцамі знакамітая асветніца св. Еўфрасіння Полацкая і палітычны дзеяч, рэвалюцыянер Вікецій Канстанцін Каліноўскі, больш вядомы як Кастусь Каліноўскі. Па сутнасці, у маіх рэспандэнтаў стаўленне да названых постацяў айчыннай гісторыі засталося нязменным.

Далей мы бачым даволі цікавыя змены. Класікі беларускай літаратуры – Янка Купала і Якуб Колас – перамясціліся з 4-га і 5-га месцаў па апытанцы 2001 г. на 6-е і 7-е – у 2022 г. Верагодна, такі вынік дало пэўнае зніжэнне ў моладзі цікавасці да класічнай літаратуры ў век імклівага развіцця інфармацыйных тэхналогій.

Класікаў літаратуры змянілі знакавыя постаці палітычнай гісторыі Беларусі – Тадэвуш Касцюшка і Пётр Машэраў. Зразумела, гэта людзі розных эпох, выхаваныя ў розных ідэалагічных дыскурсах, але ж іх жыццё і дзейнасць маюць актуальнасць для фарміравання светапогляду маладых грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія нарадзіліся ў эпоху незалежнасці. Заўважым яшчэ, што Машэраў у 2001 г. быў на 9-м месцы, а Касцюшка – на 15-м. Так што да 2022 г. значна ўзрасла папулярнасць гэтых асоб, асабліва Касцюшкі.

Калі паглядзець на пазіцыі з 6-й па 10-ю апытанкі 2001 г., то тут мы бачым выключна дзяржаўных дзеячаў ад старажытнасці да сучаснасці. Час унёс свае карэктывы ў ацэнку гэтага сегмента прадмета нашага даследавання.

Сюды, як было сказана вышэй, перамясціліся Купала і Колас, застаўся на сваім месцы вялікі князь Вітаўт, а дабавіліся канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега (13-е месца ў 2001 г.) і знакаміты беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч Васіль Быкаў (14-е месца ў 2001 г.). Так што з дзяржаўных дзеячаў у другой пяцёрцы засталіся толькі двое, а астатнія – класікі нашай літаратуры, творчая спадчына якіх мае вялікую актуальнасць для далейшага развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Такім чынам, мы склалі некаторае ўяўленне пра тэндэнцыі ўспрымання тэмы нацыянальных герояў Беларусі сярод вучняў і студэнтаў за апошнія два дзесяцігоддзі. Трэба ўлічваць тое, што дадзеныя апытанкі былі аматарскія, без выкарыстання прафесійнага інструментарыю сацыялагічнага даследавання (якім аўтар, дарэчы, і не валодае). Але тут важна было высветліць, памяць пра якіх людзей застаецца ў моладзі пасля вывучэння розных гуманітарных прадметаў і дысцыплін, каго яны могуць успомніць адразу, хто ім задае духоўныя арыенціры ў нялёгкай працы пабудовы самастойнага жыцця? Аўтар спадзяецца, што вынікі гэтага невялікага даследавання будуць карыснымі як для студэнтаў, так і для калег.